Езус, прыходзь з намі смачна паесці

Аўтар: Рэдакцыя
07.12.2014 01:00



Мы перажываем перыяд Адвэнту. Для большасці з нас гэта не першы Адвэнт у жыцці, а таму варта ўзяцца за духоўную працу, каб сустрэць Хрыста з чыстым сэрцам. У такой падрыхтоўцы да сустрэчы наша Рэдакцыя хоча спадарожнічаць кожнаму з Вас, дарагія Чытачы. Чарговае адвэнтавае “слова” даслаў нам Арцём Ткачук, які цяпер працуе ў якасці валанцёра ў Камеруне на адной з місій. Давайце паспрабуем прыняць чарговую рэкалекцыйную падказку. За калядным сталом чыта-юць Евангелле, за ім ядуць і за ім просяць прабачэння, за ім тонуць у самоце і не чуюць адзін аднаго з-за сямейнага гулу, калядны стол пераварочваюць і дзеці з маці збіраюць стравы з падлогі, яго адмыслова ўпрыгожваюць і за ім банальна вячэраюць, звычайна нешта ўзгадваецца і хтосьці маўкліва слухае. Які б ён не быў, яго заўсёды называюць калядным. Так па-людску, як кожны ўмее і хоча. †



Вось і сёлета чарговае Раство. Колькі гадоў жывём, столькі Бог прыпамінае пра гэтую таямніцу. Як быццам мы дзеці, якім трэба ўсё сто разоў паўтарыць. Адныя і тыя ж калядкі, тая ж аплатка, усё тыя ж віншаванні пробашча на Пастэрцы. Гэта ўсё падаецца такім далёкім ад неба, такім зямным і банальным, што хочацца супрацьпаставіцца, абурыцца, не скарыцца. Так яшчэ зусім нядаўна рабіў і я.

Яшчэ летась я напісаў бы, што таямніцу Богаўцелаўлення мы схаваем пад аплатак, пад вігілійны стол, пад падарункі і елку. Але шматлікія роздумы над сэнсам прыйсця Хрыста, гэтым зацёртым “Бог прыйшоў на зямлю, каб уратаваць чалавецтва” не далі вынікаў. Нават радасць з самога пошуку сэнсу ўсяго гэтага ўжо не такая свежая. У чарговы раз схіляешся перад Ім і згаджаешся, што ты проста маленькі чалавек. Застаецца пакора і ціхі рух наперад. Дык я гэта пра стол.

Упершыню ў жыцці хочацца дастаць святочны абрус, з’есці аплатку і проста схавацца

ў мяккіх Калядах. Так хочацца сказаць: “Езус, прыходзь з намі смачна паесці, пагаманіць, можа, нечым пагрэцца”. Нібы думаеш, што не хочаш зямлі, толькі неба. А нядаўна, як меў тэмпературу 40,5 і з мяне літаральна цякло, я зразумеў, як хочацца жыць і як хочацца капчонай каўбасы з сырам і хлебам. Таму сёлета Езуса запрашаю проста па-людску паесці, пасядзець і пра нешта пашаптацца. І Ён прыйдзе, бо Ён Бог і паводле Евангелля не грэбаваў гэтым падсілкавацца.

ВАРТА ПАМЯТАЦЬ Вігілійная справа дапамогі

Свечка “Карытас” на святочны стол – гэта дапамога бедным дзецям. Вялікімі крокамі набліжае

СПЯШАЙМАСЯ РАБІЦЬ ДАБРО!